Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 9 Красавіка 1915 г. № 14

## Зблiска i здалёку.

Як жэ часта людзі бачуць рэчы далёкіе, а ня ўмеюць прыкмеціць таго, што робіцца каля іх!

Ёсьць і ў нашай старонцы йшчэ багата такіх, што, жывучы між беларусамі, зусім ня бячуць таго, чым жыве наш народ, чаго жадае, што робіць. Гэтак ня ўбачылі яны і той вялікай перамены, што зрабілася ў ім за апошніе дзесяць год: не прыкмецілі, як грамада цёмных хлебаробоў разам збудзілася ад векавога сну і пачала зменяцца у сьведомы свайго *я* народ, пачала тварыць сваю національную культуру, будаваць новае жыцьцё. Шмат для каго беларускі рух — гэта нешта незнаёмае, аб чым ён ня мог бы двух слоў расказаць другім. Шмат хто ня чуе, як б'юцца мільёны сэрц беларускіх, каторые ўжо прачуваюць ясьнейшую будучыну...

„Ня бачуць" беларускага адраджэньня і тутэйшые расейскіе і польскіе націоналісты. Мала цікавілося ім да апошніх дзён жыдоўскае грамадзянство нашага краю. А тым часам кожная новая песьня-верш, што вырываецца з грудзей беларускіх песьняроў, кожная корэспандэнція, напісаная мазалістай рукой селяніна у „сваю" беларускую газэту, кожная кніжка, кожнае таварыство беларускае — ўсё гэта жывы знак, што *„жыве Беларусь" і жыць будзе!*

З суседняй з намі Польшчы ідзе кліч да згоды між палякамі і беларусамі: там бачуць і справедліва ацэніваюць народны рух. „Тутэйшые" палякі атказываюць на гэты кліч... здзекам над намі!

„Тутэйшые" расейцы, што гуртуюцца каля „Виленскаго Вѣстн., „Сѣв.-Зап. Жизни" і ім падобные—так сама ня маюць ніякай пашаны да тэй працы над стварэньнем беларускай національнай культуры, каторую пачаў наш народ. Зусім іначэй глядзяць на гэту справу расейцы ў Расеі: здалёк яны могуць абхапіць вокам усю шыр беларускаго руху і ацэніць яго, як трэба.

Дзеля прыкладу цікава пазнаёміцца с тым, што кажэ аб нашай рабоці вядомы расейскі пісьменнік *Максім Горкій.*

Гэтымі днямі выйшла ў сьвет кніжка М. Горкаго „О писателяхъ самоучкахъ" (Петроградъ, изд. „Жизнь и Знаніе" — 1915 г.). У кніжцы надрукованы стацьці, пісаные колькі год таму назад і друкаваные у расейскіх журналах. Вось, што кажэ вялікі пісьменнік аб беларускім адраджэньні:

„Я звертаю увагу недаваркоў на маладую літэратуру беларусоў — самаго забітаго народу ў Расеі, — на работу людзей, што згуртаваліся каля газэты „Наша Ніва". Я пазваляю сабе прывесьці песьню, нідаўна выданую „Нашай Нівай"; словы да яе напісаны беларускім паэтам Янкай Купалай:

А хто там ідзе, а хто там ідзе,
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.
А што йны нясуць на худых плечах,
На ў лапцях нагах, на ў крыві руках?
— Сваю крыўду.
А каму нясуць гэту крыўду ўсю,
А куды нясуць на паказ сваю?
— На сьвет цэлы.
А хто-ж гэта—іх не адзін мільён—
Крыўду несьць наўчыў, разбудзіў іх сон?
— Беда, горэ.
А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім сьляпым, глухім?
— Людзьмі звацца.

„Каб растлумачыць сабе глыбокае значэньне гэтай песьні,— каторая, мо', на нейкі час зробіцца народным гымнам беларусоў,—чытачу трэбало-б паглядзець „Нашу Ніву": яна многа цікаваго скажэ яму".

Так глядзіць на беларускі рух Максім Горкій: глыбокі сэнс, вялікую вагу знайшоў ён у культурнай рабоці беларусоў, збудзіўшыхся да сьвядомаго жыцьця...

Таго сэнсу, тэй вагі не здалелі ўбачыць тые, што жывуць побач з намі—на Зямлі Беларускай!

Занятые толькі сабой, дбаючы толькі аб сваю карысьць, яны не йдуць разам з жыцьцём,—і жыцьцё абміне іх.

а—н—а.

## ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце** у *Нёманскім і Прывісьлянскім* районі ваенных змаганьнёў праз гэты тыдзень нічога важнаго непрылучылося. Дзякуючы вясеньняму бездарожжу, тутака, як Штаб паведамляе, палажэньня без перамен. Толькі такіе дзьве весткі былі з гэтаго фронту: 1 красавіка каля Осовца немцы безкарысна меціліся пасунуцца к расейскаму распалажэньню. На Млаўскім напрамку адбываюцца карысные для расейцоў стычкі пярэдніх атрадоў. На левым беразі Бзуры расейскіе пярэдніе атрады занялі фальв. Купоцін у районі Сохачэва. 3 красавіка болей усіленая рухлівасьць пярэдніх нямецкіх атрадоў прыкмечаецца ў районі Маріамполя і Кальварыі.

*У Галіччыні.* 31 марца у *Карпатах*, у районі Ужокскаго перэвалу, бітвы не спыняюцца У ночы на 31 марца расейскае войска крыху пасонулося наперад і карысна атпёрла паўторные проці - атакі праціўніка на высоты, што болей на поўдня Волосатэ — Буковец. Проба праціўніка церайці ў наступленьне с паўдзённай стараны ат Козювкі і ў Буковіні на левым беразі Прута, ў районі Чэрновцов, ня мела карысьці. 1 красавіка расейцы пасунуліся наперад у районі к поўначы ад Ужокскаго перэвалу і карысна адбілі атакі праціўніка на высоты болей на пэўдня вёскі Волосатэ непадалёк ад Яворова і к паўдню ад Козювкі. 2 красавіка у ночы расейцы у бітве на штыхі здабылі дзьве высоты паміж вёскамі Тэлепоч і Зуела. На Ростокскім напрамку праціўнік са стараны вёскі Орош — Патак вёў безкарысные атакі на занятые расейцамі высоты. На Стрыйскім напрамку расейцы карысна адбівалі неспыняные атакі непрыяцеля. 2 красавіка ваеннае змаганьня на Карпатах найболей пашыралося на участку паміж вёскамі Тэлепоч—Зуела, гдзе расейцы пасьля страшэнна заўзятых бітвоў на штыхі уцьвярдзіліся на ўмацаваных праз непрыяцеля высотах. На Стрыйскім напрамку расейцы карысна аткінулі атакаваўшые іх непрыяцельскіе атрады. 3 красавіка бітвы пашыраліся у Ростокскім напрамку. Праціўнік, ня гледзючы на вялікіе страты, у працягу сутак зрабіў вялікімі сіламі 16 безкарысных атак на ўзятые расейцамі высоты на ўсход ад Тэлепоча. 4 красавіка расейцы ізноў адбілі дзьве атакі на Стрыйскім напрамку. Расейскае войска ў ночы ва 4 красавіка пасьля заўзятай бітвы заўладало высотай на паўдня-ўсход ад в. Полена. Тры проці-атакі праціўніка на гэту высоту адбіты. У ночы на 5 красавіка праціўнік ізноў вёў атакі проці расейскаго войска на высотах к паўдню ад Тэлепоча. Проці-атакай расейцы прымусілі праціўніка пасьпешна зыйці ад падходаў к расейскім пазыціям. 5 красавіка расейцы адбілі стрэлянінай і ручнымі гранатамі непрыяцельскіе атакі на расейскіе пазыціі к усходу ад Тэлепоча і Полена. На Стрыйскім напрамку атака непрыяцеля на высоту каля Оравчыка спачатку была карыснай, аднак к вечэру расейскае войска, церайшоўшы у проці-атаку, пасьля заўзятай біты узяло гэту высоту. Ва ўсіх гэтых бітвах на Карпатах расейцы захапілі немала палонных і кулемётоў.

**На Каўказкім фронце** ва ўсіх напрамках найболей ідзе перастрэлка і невялікіе стычкі пярэдніх атрадоў. На Артвінскім напрамку расейскае войска карысна пасовывалася на паўдня.

**На Заходнім (францускім) фронце**—нічога важнаго.

**На моры.** У Дарданелах хаўрусны флот усё абстрэлівае турэцкіе надберэжные украпленьня.

## Па сьлядох вайны.

*Ад нашаго карэспандэнта.*

У маленькім аддзелі вагона сядзелі мы і цэлы час гутарка ішла усё аб адным, што так блізка чуецца цяпер кожным: калі яна кончыцца, што за карысьці прынясе нам гэта страшная барацьба народоў? Яшчэ жыло ў нашай памяці сьвежае уражэньне наступленьня немцоў

а наш сусед, малады прапаршчык, адзін з абаронцоў Г , павесьціў аб гэтых бітвах. Ваенны доктар, каторы так сама прылучыўся да нашай кампаніі, высказываў дзіўные, часам незразумелые з'явы з жыцьця раненых салдатоў.

— «Раз — павесьціў доктар,— пасьля боёў пад мястэчкам N. шмат раненых прыносілі і прывозілі ў наш лазарэт; ўсюды чуліся стогны і енкі, мы—3 дахтары—зусім выбіліся с сіл, працавалі без ніякаго адпачынку. Пад канец гэтай надчэлавечай работы прынесьлі на насілках яшчэ аднаго салдата; меў ён прыгожы, яшчэ зусім дзіцячы твар, ясные вочы. Пытаюся санітара: што з ім?

— А так што, Вашэ Благародзе, яму ногі адарвало.

— Агледаю—бачу, сьмерць наступіць праз дзьве-тры гадзіны.

— Што—канец? — пытаецьён, кідаючы на мой твар блескі гарачаваго сьвету.

— Дрэнна, братку,—с табой,— кажу яму.

—Нічога, пане! толькі дазвольце каб хто напісаў прад сьмерцяй пісульку да маіх бацькоў.

«Клічу сястру. Тая бярэць паперу і пішэць пад яго загадам ось як: «Дарагіе мае татачка і мамачка! Паведамляю я Вас, мае дарагіе, што я жыў і здароў, аба мне ня рупцеся, хутка вярнуся да Вас...» Тутака голас яго дрогнуў, прытомнасьць апусьціла і пачалося канaнане.

«Я, пане, прывык усё бачыць, нэрвы загартаваў, бытцам сталь, а аднак гэты вобразак разжаласьціў усіх нас».

Сумна, ціха зрабілося у нашым аддзелі пасьля апаведаньня доктара, ценъ маладога ваякі стаяў перэд вачыма і не было ахвоты больш гутарыць.

Тым часам машына падходзіла пад Г .

Каля сьцен гэтаго места тыдзень таму назад ішла страшэнная барацьба і сотні маладых сіл тут злажылі свае галавы. Доўга шрапнэлі і гранаты лётали над Г , а жыхары чулі блізасьць ворага, але не ўдалося такі немцу ўехаць у вароты старай гістарычнай замковай гары.

Само Г не пацярпело; праўда,—нямецкіе самалёты колькі разоў кідалі бомбы, але ўсей шкоды ад іх — разьбітые шклы у вокнах.

Ваколіцы Г немаль зусім знітожэны. Бездомные людзі налічываюцца сотнямі; адны знайшлі прыпынак у далейшых суседніх вёсках, іншые выехалі у Г і другіе месты. У найболей цяжкім палажэньні жывуць яны у Г

у бедакоў ня толькі німа грошэй, але ў некаторых нават і адзежы.

Агледзеўшы Г я на трэці дзень вечарам выехаў у К

Мястэчка гэта невялікае, ляжыць па лініі чыгункі у верстах ад Г . Тутака я сустрэў шмат людзей с і іншых мейсцоў. Большай часьцю гэтые людзі здалелі уцячы, як стаялі, не захапіўшы с сабой ніякіх запасоў. Склад національны гэтых уцекачоў хоць гутарка іх дужэ ня чыстая, з вялікай прымешкай польска-мазурскай мовы.

Ў гэтых ваколіцах я абгледзіў больш за 40 сем'яў; у большасьці жывуць яны у дужэ дрэнных антысанітарных варунках; не атрымліваючы ніадкуль помачы перэбіваюцца з дня на дзень жэбранінай сярод тутэйшых грамадзян.

С К у Н я выехаў на другі дзень па палудні, дастаўшы фурманку ад тутэйшаго этапнаго камэнданта.

Мой фурман, сярэдніх лет, спачатку с-пад лоб'я пагледаў, думаючы, што маець справу з «начальнікам», але адна-другая папероса, колькі пытаньнёў аб жыцьцю-быцьцю і гутарка пашла як па масьлі, так што пад канец дарогі мой сусед нават даведываўся у мяне, ці гэта праўда, што ў іх цьвердзяць па вёсках, бытцам дзеля таго, што чорнагорскаму каралю спадабаліся нашы людзі, што «надта пекные, дый белые», маець быць ім зроблены замен з нашым царом на пяць тысячоў кабетоў. І вось майго фурмана найбольш цікавіло, як гэтых кабет будуць у нас выбіраць: па валасьцёх, ці па вёсках, па добрай волі, ці пад прымусам. Але так і не ўдалося бедаку закрануць у мяне што-небудзь новаго аб гэтай справе, бо, паміма найшчырэйшых жаданьняў даць яму патрэбные ў гэтым раз'ясьненьня, быў я ня ў курсі спраў чарнагорскаго караля; ня чуў нічога аб такой вялікай сымпатыі да белаго роду.

Але ось мы і ў Н

У мястэчка за балотам німа змогі ўехаць, па вуліцах справа ня лепшая,

Тутака ўсюды кішыць баевое жыцьцё, ва ўсе стараны ідуць вазы, наладаваные харчамі, на выскачку лятуць казакі с пакетамі пад пахай.

Трохі падмацаваўшыся ядой еду агледаць ваколіцы. Як і куды ехаць растлумачылі маему фурману у мястэчку, але як толькі мы пераехалі на другую старану жалезнай дарогі, дык пачалася такая крутня-мутня дарог, дарожак дый сьцежак, што мой вазака ніяк ня мог зразумець кудой нам трэба, і толькі бульба выратавала нас з безнадзейнаго палажэньня, бо, убачыўшы на аднэй з дарог разсыпаную бульбу, мой фурман цьвёрда уверыў, што тамака нам і трэба ехаць — там і будуць спаленые вёскі: відаць хтосьці с селян знайшоў яшчэ крыху бульбы, дык ось і вязе на яду. Так яно запраўды і было, аб чым нам і сказаў на другі дзень адзін с тамашніх жыхароў. Але ось мы і у тым мейсцы, што яшчэ пара тыднёў таму называлася вёскай Р . Цяпер тут толькі разваленые коміны, пабітые чыгуны, дый дзе-не-дзе кавалкі ад малатарнёў і сечкарнёў гаворуць, што тут жылі жывые людзі.

Цяжка робіцца на душы праезджаючы па гэтай пустыні: усюды попел дый развaліны і толькі на канцы вёскі у куточку стаіць, бытцам схаваўшыся пад вербы дый бярозы, старэнькае гуменцо; нейкім цудам уцалела яно ад агульнаго знітажэньня, а яго гаспадар, дзевяцьдзесятлетні старэц ня хочэ пакінуць родную глебу і сядзіць сабе каля гуменца, распаліўшы агонь, як той набожны пустэльнік старых часоў. На маё пытаньне, чаму ён тутака адзін астаўся, сьлёзы паліліся з вачэй старца і, ўсхліпываючы, як маленькае дзіцё, атказаў, што хочэ тут, дзе узгадаваўся, жыў і састарэўся, злажыць свае косьці.—«Не, німа куда мне ісьці, панок, і нікуды я не пайду... Гэта кара, цяжкая кара Вялікаго Бога...» а голас яго дрыжачы выдаваў такую шчырую, такую цяжкую жальбу...

Страта ў вёсцы Р запраўды вялікая: спалена усё, апрыч гэтаго старога напоўразваленаго гуменца; вёска налічывае 50 дамоў, а жыхароў: мужчыноў—134, кабетоў—232.

Селяне с сем'ямі парасходзіліся па суседніх ваколіцах, шмат жывець і ў мястэчку Н . Цяжка жывецца бяздомнікам, некаторые не маюць нават вопратак. Тым часам ужо і весна не за гарамі—трэба засеваць поле, а ў гаспадароў ні кала ні ваза. Запасу хлеба і бульбы ніхто ня здужаў захапіць, дык хто меў крыху грошэй неяк перэкідываецца, а рэшта жыве у перамешку з голадам, бо суседзі мала могуць памагчы: самі нічого не маюць,

Ужо добрым вечэрам паехалі мы ў суседнюю спаленую вёску Я З вялікай цекавасьцяй ехалі мы цераз пекные горкі, дый лескі, пад'езджаючы да за каторы ішло такое страшэннае баевое змаганьне: немцам быў дужэ важны і страшэнна хацелася ім захапіць яго

**П. Алексюк.**

(Далей будзе).

# КАЗКІ ЖЫЦЬЦЯ.

## ВАДАСПАД.

I

На гэты вадаспад, што так гучна сакатаў на ўсю ваколіцу, было шмат нарэканьня. Нарэкалі на яго альшыны, зьвесіўшыеся над ім зялёным вяночкам злучаных ў гары верхавін; марыкаваў лес; нават сярод птушак пападаліся такіе, што ня мелі вока на гэты шумлівы, заўжды парывісты і гаворкі вадаспад.

— Ці дасі веры, любачка, — казала чорнарудая пліска капельцы роскі, што выступіла на чорнабыльніку: — такі жаль, такі жаль! І навошто дае Бог сілу? Ці-ж для таго толькі, каб крыўдзіць слабых?

— А што такое, мілая плісачка? — спытала роска.

— Ох! несла я пушынку,—такое прыўдалое перцэ! Ну, думаю, добрая будзе пасьцелька для маіх дзетак. Аж ляту праз вадаспад, выпусьціла пушынку, — і папала яна якраз у гэты прожыр — вадаспад — і прапала... От і вазьмі-ж ты—такая самая, здаецца, вада, такая-ж самая, як і ўсюды; ды і ты сама, любкароска, така-ж самая вадзіца, як і ў тым вадаспадзі, а вот-жэ ты спакойна, і с табою люба пагаманіць.

Луч сонейка, прабіўшы гушчар зялёнаго лісьцьця, крануўся да роскі, і яна ўся заіскрылася, зачырванелася, бы тая гожая дзяўчына, каторай сказалі, што яна прыгожа і міла.

— Я — частачка таго самаго вадаспада, на каторы ты так крыўдуеш, — сказала расінка і яшчэ больш загарэлася: ёй прыкра было слухаць гэту скарду пліскі-доўгахвосткі, бо і сама яна, роска, была крыху вінавата у гэтым яе горы.

— Ты?! — здзівілася плісачка.

— Я, я... прабачай, мілая! —

Чорнабыльнік, учуўшы гэта, ціха засьмеяўся і скачануўся ад сьмеху. Беднай росачцы зусім сорамна стала, і яна, адбіўшы ў сабе апошні раз прамень сонца, упала на дол і згінула. Здзіўленая плісачка паківала галоўкай, павярцела хвосьцікам і паляцела падскокам на новые раздабыткі.

II

У высокіх алешын, што стаялі непадалёку, так сама былі прычыны вялікаго нездаволеньня з вадаспаду. Алешыны — дзярэўякампанейцы, яны любяць гурт, любяць жывую бяседу з ранічнымі ветрамі; і яшчэ любяць алешыны сваіх дзетак. І старые алешыны крычалі адна другой на вуха, каб перакінуцца хоць словам, але нічога не маглі расчуць за страшэнным шумам вады. Яны нахіляліся, лучыліся верхавінамі, — ўсё дарэмна: гінулі іх словы, і думкі іх прападалі у іх самых. І ці ня зьдзек рабіў ім гэты здраднік-вадаспад? Дзе іх дзеці? Чым пацешуць яны свае старые вочы? Хто дасьць полёгку ім у старасьці? І толькі адна крайняя алешына зрэдка мела магчымасьць загаварыць з дожджыкам. Старая кожны раз дзякавала дожджыку, што ён не пагарджаў ёй.

— На сэрцы робіцца лягчэй, калі хоць слоўкам перамовішся, — казала старая: — І чаму ня ўсе роўны на сьвеці: і ты, дожджык, вада і там вада... а вазьмі-ж ты...

— І я тая самая вада, што ў вадаспадзі; яшчэ тыдзень таму я грымеў там разам з мільёнамі другіх капак, — з гордасьцяй прамовіў ён тысячамі дажджынак.

У гэты момэнт хмаркі разарваліся, сонейка зірнула на зямлю бліскучымі стрэламі яркіх праменьняў, і дрыготнымі зоркамі заварушыліся, зазьялі каплі дожджыка на старой алешыне.

— Не, ня можэ быць, ня можэ быць! — зьдзівілася яна: — ці ж можна раўняць іх?..

Ах, як хацелася ёй пагаманіць аб гэтым с суседкамі!

III

Старасьвецкі лес, асабліва тые сынэ яго, што стаялі непадалёку ад вадаспаду, даўно ўжо сярдзіта шумеў, сварыўся і гразіў вадаспаду. Лес любіць спакой, у леса ёсьць важные думкі, мары; лес хочэ паслухаць, як сьпеваюць прыгожые, птушкі, як шэпчэ зялёнае лісьцьце с ціхімі каплямі цёплаго дожджыку; лес хочэ унікнуць у самую нетру цішы, і часоў таёмнасьць ён хочэ пранyць. Лес любіць і буру, паспорыць з ветрамі-вар'ятамі ён неацказан; лес любіць рух-сілу, але вечнаго неупыннаго шуму вадаспада лес ня мог слухаць,—можэ затым, што вадаспад балабаніў адно і тое. Праз гэты лес бегла праворная, жвавая рэчулка. Адвечные хвоі з гладкаю карою звісалі над ёю і часамі любілі пагутарыць з гэтай рэчулкай. І як было не любіць яе, калі яна так уважна, так прыветна вілася мікарэнямі.

— Вот у каго трэба вучыцца вадаспаду, гэтаму балбатуну, млыну пустому, — казала старая бярэзіна, выгнуўшыся над рэчулкай.

— Праўда, — падхватвалі хвоі: — дзеці якбы адных бацькоў: і там вада і тут вада, а нораў ня той.

— А можэ не ўся вада аднакая, — уставіў сваё слово высочэзны вяз: — і не ўсягды яе роўны нораў? Ці не ўрода тут мае глаўную сілу? То тады нечага раўняць вадаспад... ну, хоць-бы з нашай рэчулкай. Можэ каб наліў у яе вады з вадаспаду, то і яна зьверам загула-бы.

Дзярэўя змоўклі і задумаліся.

А можэ і праўда.

Крыху паразважаўшы, зноў зашумелі дзярэўя, шукаючы пачаткоў і канцоў, і не маглі іх знайці.

— Скажы ты нам, рэчулка, развaж нашу спорку, — зьвярнуліся дзярэўя да рэчулкі:— чаму ты такая уважная, такая спакойная, што сэрцэ цешыцца, пазіраючы на цябе; а чаму вадаспад такі ганарысты, такі надзіманы? Ёсьць у цябе што небудзь супольнаго з вадаспадам? Адна у вас натура ці не?

Рэчулка чуць-чуць здрыганулася.

— Ведаеце што, мае мілые: часта бывае так, што не знаць чаго лепш, чымся ведаць яго: праўда часамі кладзе непраходную сьцяну меж найлепшымі дружакамі.

— За тое-ж праўда і раскідае гэтые сьцены! — сказаў стары дуб.

— Так... Ну, калі хочэце, то скажу вам, толькі-ж не кайцеся: я — частка таго самаго вадаспаду!

Яшчэ болей задумаўся стары лес.

**Тарас Гушча.**

# „СТРАЖНІК“ *).

Звазіўшы хлеб, Амільян, гэтак як і даўней бывала, пачаў патроху малаціць. Яшчэ ўперад, дык Манька яму памагала, а цяпер трэба было аднаму, бо памагчы не было каму. Міхалка свайго не малаціў, бо нават яшчэ й цэпа ніколі не трымаў ў руках. Ён думаў у

*) Гл. „Н. Н.“ № 12—13.

## З Даугінаускага боку.

*(Ад нашаго карэсп. з вілейск. пав.).*

Вялікоднае сьвята.

Ай, каб бардзей на вёску, у родны свой кут! Т-ож я там радзіўся, рос, крапчэў, а ў мяне ўзрастала усё, што жыло дакола. Узрастала і разрасталалася, бо любіў і шанаваў я ўсё. Цяпер я кружуся ў віхры каменнаго халоднаго горада, кінуў дрэўляную, прытульную вёсачку, кінуў, як ашуканую дзяўчынку на бездарожжы. Чаму? За што? Ой, гора-ж маё. Бо так захацеў Час, Горад, так захацеў я. Але вёска мяне не прагоне, яна даруе, выслухаіць грахі мае, дадасьць моцы, намеціць пуцявінку, запаліць да змаганьня з ворагам яе. Бо ці-ж не я верны сын яе? Ці-ж не я гатоў на мукі, на сьмерць за вёсачку маю убогую-багатую? Ці-ж ня я люблю яе больш усяго на сьвеці?!

Ай, каб бардзей на вёску!

Чую ужо, чую, як скверуцца бульбяные аладкі на патэльні, а пах верашчакі лезіць у нос і сьлюнкі гоніць, гоніць, ані паўстрымаць. Цк! «Вясёлы нам дзянёк настаў...»— зацягнулі валачобнікі разам з іскрыпкаю.

— Але чуеце, як Цыпрусёнак прылаўчыўся іграць!..

— · —

Ясны, лагодны, павабны дзянёк. Мінаю вёскі, мястэчкі. Селяне распытываюць аб вайне, аб цане збожжа, корму, толькі жыды дык аб вайне маўчок,ціскаюць плячамі, ажно так і хочэш за іх сказаць: мая хата с краю—нічога не знаю.

Вось я ўжо ў сваей хацінцы. Мяне вітаюць радасна, роднай вышкаленай мовай. Нехаця шукаю перамен, адбудовываю старое. Вось я ізноў падшпарак, піскляне; ізноў у гнездзечку на пахнучым раскідзістым кусточку пад прытульным скрыдлам бацькоў і прыроды.

Ой, як люба, шчасна, добра! Але добраго па трошку, як кажуць людзі; хай будзе гэтак.

— —

Паэты, хадзіце ка мне, я вам дам славу Мольера; людцы панурые, горэм прыбітые, хадзіце, я вас разсьмешу да колек; усё жывое, што сьмеху не знае, хадзеце сьмяцца, бо я ўсім вам пакажу шляхту с свайго боку: людзей, што ад неба адарваліся ды й зямелькі не дастаюць, і хістаюцца туды, куды павеіць вецер.

Равець, гарланіць грамафон, а пад музыку яго перэбірае нагамі, ссохшы ад зайздрасьці з блескполыску, шляхтун, п'янюсенькі ад самагонкі. Выкручываецца ды бэсьціць нейкім жаргонам мову селян і разам сваю. Дэвіз гэтай шляхты: мужык — не брат, рубель ня грошы. Яны топюць жыдоў і ліжуць ім рукі; дачок сваіх, што ня могуць выгаварыць «унівэрсытэт, конституція», школюць, чаму не выходзяць замуж, а сыноў вучуць так, каб не перавучыць, каб пасьля пазычаць ім грошы на карты. Даўно яны забыліся родные песьні, казкі... ёсь у іх новая літэратура: плёткі яны іх так скруцілі, заплуталі, што каб нашоўся які сьціпны чэлавечык іх раскруціць, то якраз зямлю да сонца мог-бы прывязаць.

Эх, неразважные, дуплаватые галовы! яшчэ паказываюць патыліцу, чмыхаюць, крыўдзюцца, калі я ім сказаў, што так жыць вельмі брыдка, блага, што гэты дзікі нарост—воспа іх душы.

— —

Дачуўся я, што быўшы старшына Рэтковіч хочэ купіць грамафон, а у вёсцы Пярхуроўшчына ёсьць ужо пяць грамафоноў. Ўжо пяць, а што-ж далей будзе? Добра, калі гэта сьведчыць аб эканамічным развіцьці, калі поле ўзарана добрым плугам, забаранавана жалезнай бараной, калі хата на падлозі з вялікімі вокнамі, а над маляваным сталом вісіць багатая лямпа. Хай сабе пяе, йграе грамафон пасьля тлустай капусты, вірашчакі з аладкамі, хай йграе, калі яго слухаюць людцы сьвядомые, сьветлые, дужые у сваей мові, с сваімі песьнямі, традыціямі. Хай йграе! . Але баюся, што ён у нас непатрэбшчына; дзіка выгледае ён у хаці селяніна, дзе німа ні аднаго друкованаго слова, апроч кантычкі ды і то у польскай мові; у вока коліць, ня йдзець, вось як тая камізэлька сабаку, ці барадаўка на носі. Баюся, што ён сваім хрыпатым голасам клічэ ачмучанаго нашаго селяніна, што стаіць на разпуцьці, клічэ у павабны горад, дзе, раскланіваючыся с кулаком у кешані, перайманіць яго пінкертоноўшчына...

А бардзей-жэ запрагайце коні паеду. Паеду са сьпешкай-спа

---

Піліпаўку наняць аднаго маладзьбіта, ды усё адразу змалаціць.

На Пакровы Міхалка паехаў нечага да Койданава, нават і жонцы сваей не сказаў, чаго. Але людзі ведалі, чаго ён ездзіў, бо німа нічога таго, каб у вёсцы ніхто ня ведаў. Гэтак і цяперака. Перад Пакровамі да Міхалкі прыежджаў знаёмы стражнік і казаў, што ў Койданаві трэба аднаго стражніка. Вось дзеля гэтаго Міхалка і папёр да Койданава к прыставу. Але тамака, як на тое ліха, прыстаў яму атказаў і нарэсьці дадаў, што гэтакіх стражнікоў, як Міхалка, яму ня трэба.

Прыехаў Міхалка дамоў п'яны, як гразь, нават сам каня ня мог распрэгчы. Толькі што ён заехаў на двор, як убачыў, што Амільянава цялушка залезла к яму на гумно і растрыбушыла мэтлік пшаніцы, што йшчэ ў яго сушылася. Божухна мілы... як закрычыць, як схопіць кол, ды за гэтай цялушкай, прыпёр яе ў завулак, ды як перацягнуў разы са два, дык тая, небарака, толькі нагамі задрыгала, ды зароўла.

Пачуўшы на дварэ Міхалкоў крык, Амільян з Альжбетай павыскаківалі с хаты і пабеглі на гумно, дзе Міхалка лямэнтаваў на ўсё горла.

— «Пазабіваю, пастрэляю!» — крычаў ён: «зладзеі!.. мала таго, што кралі жыта, дык яшчэ каровы задумалі карміць!»

Убачыўшы, што цялушка ляжыць з высунутым языком, Альжбета толькі рукі заламала і пачала галасіць да прыказываць.

— «Уй, злодзей!.. сыдзі з глаз», — зароў Міхалка і кінуўся на Амільяна с калом.

Амільян неяк выкруціўся, схапіў брата за каўнер і пачалі тузацца. Міхалка быў п'яны, зачапіўся неяк нагою і брыкнуўся пад Амільяна, а гэты са злосьці нават добра нашпокаў яму. Не глядзеў куды, біў па чым папала і, каб не прыбеглі суседзі, дык бы ён там кончыў яго. Суседзі расьцягнулі іх, Міхалку павялі ў хату, а Амільян з Альжбетай дарэзалі цялушку, бо ўсёроўна нічога-б не было—не сягоньня, дык заўтра здохла-б. Дома Міхалка крычаў на ўсю хату. Злосьць на брата кіпела ў ём; ён зрабіўся ўвесь зялёны, вочы набеглі крывёй і ён нідзе не знайходзіў сабе мейсца.

— «Ён мяне будзе помніць злодзяй гэны! Я жывы ня буду, калі я яго не застрэлю, як сабаку», — лямэнтаваў ён на ўсю хату, стукаючы кулаком па стале.

— «Міхалка, ды годзе табе,» — супакоівала яго жонка: «ты-ж сам вінават, ён-жэ цябе не чэпаў».

— «Вон, а то й цябе прыстукну!» — кінуўся ён да жонкі і, каб тая не адляцела, дык-бы мусіць «чырвоная» пацякла з носа.

Доўга ён крычаў і вар'яваўся, але ўсё такі перастаў. Волька схадзіла, распрагла каня, дала яму сена і сама легла спаць. Спала і ўся вёска, толькі Янкаў сабака сядзеў сярод вуліцы і, падняўшы галаву на Амільянаву хату, так страшна выў, што аж вусьцішна рабілася і шорах па целі хадзіў.

— «Што яму за ліха?» — казала Альжбета: «проста аж нудна слухаць».

— «Ды што там слухаць сабакі», — адазваўся Амільян: «пачуў вось кроў ды мяса, дык і вые. Сьпі ўжо ты».

Але Альжбеці доўга не спалося. Думкі цэлым роям круціліся ў галаве, а сэрцэ чула нешта нядобрае. Толькі каля поўначы яна заснула і заснула гэтак крэпка, ўсероўна, як нежывая. Ноч была цёмная, хоць у вока кальні, дык не ўбачыш. Кругом было ціха.

Была якраз поўнач. У гэту самую пару з Міхалкаваго двара высунулося нешта цёмнае і, крадучыся ды прыгінаючыся, пашло да Амільянаваго току. Чутна было, як у гумне скрыпнулі вароты і ўзноў усё сьціхла. Гэта невядомае падыйшло да Амільянавай паветкі, дзе была зложэна салома і нагнуўшыся палезла пад нейкіе дошкі. Пасьля нешта заплюхала, усёроўна, як лілі з бутэлькі ваду, бліснуў агоньчык, і ў адзін момэнт у гумне зрабілася відна, усёроўна, як днём: гарэў Амільяноў ток. Агонь с паветкі пераскочыў на хлеў, загарэлася стрэха, а тут-жэ разам стаяла й хата.

Жывёла, пачуўшы дым, пачала раўці і біцца ў дзьверы... а Амільян спаў.. Толькі ўжо як у хлеві ўвалілася стрэха і пачала гарэць хата, тады Амільянавы прачнуліся.

— «Амільян! ты сьпіш?» — закрычала Альжбета «чаму гэта відна на дварэ?» і яны разам кінуліся ў дзьверы.

— «Пажар!.. Людзі, ратуйце!»— загаласіў Амільян, выскачыўшы на двор. І ледзьве ўсьпелі яны павыносіць дзяцей, як пачала гарэць хата.

Людзі сабраліся скора, але ратаваць не было ўжо чаго, бо ўся Амільянава сяліба гарэла.

— «Божэ літасьцівы!.. ўсё... ўсё, што меў, нічога не асталося, ледзьве дзяцей выратавалі!» — галасіў Амільян.

Тым часам агонь не дрэмаў, ён еў усё, і да ўсходу сонца заместа хаты, току й хлева лежала куча абгарэлаго бярвеньня, з-за катораго ў хлеві выглядалі абгарэлые страшные пасьледкі каня і каровы. Конь перакаціўся неяк дагары і яго ногі пазагіналіся ў кручкі, а карова ляжала ў кутку падняўшы галаву, быццым пыталася ў людзей: «чаго вам тут трэба?»

К абеду прыехаў прыстаў,ураднік і сталі распытываць у людзей, с чаго узняўся пажар. Ніхто ня ведаў і ўсе маўчалі. Прыстаў пачаў дапытывацца ў людзей і сказаў, каб пазвалі Міхалку.

— «Німа дома», — зягаласіла Волька: «ноччу недзе пашоў і дагэтуль німа».

— «Ага-а-а», — працягнуў прыстаў, і, даведаўшыся, што браты ўчора біліся, ён нічога не сказаў і пашоў на пажарышчэ.

Там, дзе стаяў ток, мужчыны ўжо сталі расьцягіваць бярвеньня і згрэбаць у кучу попел. У тым мейсцы, дзе стаяла паветка лежала куча саломы, а зьверху на ёй Амільян наклаў сырых дошчак. Дошкі зьверху абгарэлі, а с-пад нізу ўсё было цэлае. Толькі што мужчыны сталі знімаць дошкі, як адзін закрычаў нейкім дзікім голасам і ўсе кінуліся туды. Адвярнулі дошкі далей: там, увесь чорны, абсмалены лежаў Міхалка. Вочы яго былі вытрэшчаны, адзежа абгарэла і ўсё цела палопалося. У руццэ ў яго быў жалезны бітончык, каторы так і дзержаўся у скручэных пальцах.

— «Ой! Божэ мой!» — загаласіла Волька: «гэта-ж наш бітончык. Мы ўчора прывезьлі газы с Койданава... Міхалючок мой, што-ж ты гэта нарабіў?» — і яна як стаяла, так і брыкнула на зямлю.

— «Эх, Міхалка, Міхалка», — заплакаў Амільян: натварыў ты на сваю галаву».

Ён нагнуўся над братам і яго сьлёзы закапалі на абгэрэлаго Міхалку. А прыстаў толькі паглядзеў ды сказаў: «Дурны чэлавек», і паехаў да дому.

**С. Бірыло.**

(Канец).

рышка бо работы хоць адбаўляй. Хутчэй, браткі!

— —

Лятуць конікі па зямельцы быўшаго Даўгінаўскаго княжства. Дужа шкадую, што сонцэ ўжо схавалася: апісаў-бы тое-сёе. Цемень. Жах. Вун сініе агоньчыкі. Я ведаю, што гэта мне здаецца, бо там лежаць валатоўкі-курганы. Баюся аглянуцца, бо за плячмі неяк жудасна, непрыемна. Каля вуха правевае холадком. Чую шопат. Веру ў шопат. Веру, што устануць волаты-вялікалюды. Устануць і галавой упруцца ў неба Ой гора-ж тым, хто не здалее прапсацца да іх ускрасеньня, бо ўсіх абудзіўшыхся братоў сваіх малодшых абдоруць устаўшые волаты зоркамі, што дастануць магутнай рукой сваей з неба.

Мне сумна і весяла.

Паганяй, брат, коні, паганяй!.

**Л. Р.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Абавязываючымі пастановамі** для жыхароў дзьвінскаго ваеннаго округу загадываецца: 1) Выдаць ўласьцям, у каго ёсьць, трохлінейные казённаго калібру вінтоўкі і ў будучыні так сама выдаваць іх належачым ўласьцям. 2) Усе асобы, што займаюцца таргоўляй найпатрабнейшымі спажыўчымі таварамі (мука, крупы, цукер, мяса, соль, сернікі, газа, дровы) павінны вясьці акуратны спіс усіх, якіе ёсьць у іх, запасоў і падаваць гэтые спісы як толькі зажадае таго паліція ці падатковая інспэкція. Вінаватые у невыпаўненьні гэтых абавязываючых пастановоў будуць карацца штрафам да 3000 р. або арыштам у турме ці крэпасьці да 3 месяцоў.

Па Палескіх чыгунках апавешчана такая абавязываючая пастанова, караючая вінаватых да 3 месяцоў арышту або 500 руб. штрафу: 1) Забараняецца пастароннім асобам знаходзіцца бліска поездоў з ваеннапалоннымі і вясьці гутарку з імі. 2) Забараняецца ў межах жалезнадарожнай паласы купляць ад палонных належачые да іх рэчы.

**Дзельба забранаго ад немцоў дабра.** У сваім часе мы пісалі, што ў Вільню прывезьлі забраные ад немцоў сельска-гаспадарскіе прылады. Цяперака асаблівая камісія прыступіла к дзяльбе гэтых прылад паміж пацярпеўшымі ад вайны жыхарамі віленскай, гродзенскай, ковенскай і сувальскай губ.

**Уцекачы.** Надовічы прывезьлі у Вільню вялікую парцію высланых з мейсцоў ў районі ваенных змаганьнёў уцекачоў-жыдоў. Каб не было у горадзі пашырэньня пошэсных хвароб, пастаноўлена ў Вільні вывезьці уцекачоў, жывучых у цэнтры горада, у акалічные і дачные мейсцы.

**Суд.** Ваенна-акружны суд засудзіў запаснога Г. Фёдорова на 2 с палавінай гады дысьціплінарных батальёноў затое, што ён ў часе адступленьня войска з Усходней Прусіі самавольна пакінуў сваю «дружыну» і атправіўся ў сваю вёску на госьці. Гэты-ж самы суд засудзіў запаснога Кулешова на 2 гады дасьціплінарных батальёноў за тое, што ён ня слухаў начальства і не аддаваў чэсьці. За сумыснае з абдуманай раней мэтай убіўство 18 летней дзяўчыны ваенны суд засудзіў на кару сьмерці цераз павешэньне ахвотніка 51 запасного батальёну І. Фрыдэнбэрга. Ваенна окружны суд засудзіў на кару сьмерцяй цераз павешэньне салдата 175 запаснога батальёну, Уракбаева, за тое, што ён у прахадзіўшай пані вырваў з рук торбачку з грашыма і драгоцэннымі рэчамі вартасьці 2,300 р.

**Пажар.** У вёсцы Голубках, лідзк. пав., згарэла 8 хат і 12 халодных будоўляў з дабром 10 селян-гаспадароў. Страты 6000 руб. з лішнім.

**Помста малпы.** Надовічы ў Вільні у цырку вылезла ў ночы малпа с клеткі і напала на спячаго машыніста. Згрызла яму скуру з галавы, перэкусіла правую руку і і пачала кусаць нагу. На крык нешчаснаго збегліся служачые цырку і выратавалі яго з рук раз'юшэнай малпы.

**Цэны у Вільні.** Жыта за пуд 170—175 кап., авёс 180—190, ячмень 140—145, отрубі 115–120, гарох 200—275, фасоля 200—260, соль 85—90, сена 75—85, канючына 80—90, салома 50—60 кап. бульба асьміна 200–220 к., яйкі дзесятак 45—50, сьметана кварта 40—45, тварог кварта 15–20 кап. Жывые і колотые парсюкі плацілі да 10 руб. за пуд. Апошнім часам цэна аўса даходзіць да 2 руб. за пуд.

## З Міншчыны.

**У Бабруйскай крэпасьці.** Начальнік Бабруйскаго гарнізону апавесьціў абавязываючую адозву, па каторай пад страхам срогаго атказу па закону, забараняецца жыхарам гор. Бабруйска хадзіць у некаторых мейсцох крэпаснога району, а такжэ насіць пры сабе ў районі крэпасьці фотографічные прылады і пад'зорные трубы.

**На змаганьне с пошэсьцямі** мінскае паветовае земства стараецца атрымаць 34,000 руб.

**Забаронена лавіць рыбу у р. Свіслочы** ў граніцах гор. Мінска.

**Аб аткрыцьці спажыўчых таварыствоў** стараюцца жыхары м. Любані, бабруйск. пав., і ў двары Омнішчэві, барыс. пав.

**Штраф.** Мінскі губэрнатар аштрафаваў жыхара м. Баранавічы Я. Каплана на 1000 руб. або 2 мес. арышту за тое, што ён падняў цану на мяса.

**Мазырскае земство** стараецца аб тым, каб як упараткаваць і прывясьці ў прыгоднасьць для плаваньня караблёў прыток р. Прыпяці—р. Уборт.

**Патайны браварок.** Доўгі час жыхаром барысоўскаго пав. хапало гарэлкі і без казённай яе прадажы. Аж вось надовічы выкрылося, скуль гэта сьвянцоная крыніца бярэ свой пачатак. У глухой закінутай мейсцовасьці павету, у маленькай вёсачцы Мачулішчы, Гайна-Слабадзкой волясьці, апошнім часам паліція выкрыла патайны браварок. Выкрылі пакуль што двух «гаспадароў» браварка—Мікалая і Станіслава Ліхтаровічоў. Абодвы арыштованы.

# З усіх старон.

**На змаганьне с пошэсьцямі.** Міністэр унутрэньніх спраў дамагаецца ад Рады міністроў асыгнаваньня 3 мільёноў руб. на змаганьне с пошэснымі хваробамі.

**Хваробы на вочы у войску.** Чырвоны Крыж наладжывае тры аддзелы помачы хворым на вочы ваякам на паўночна заходнім, паўдзённа-заходнім і каўказкім фронце.

**У касе Чырвонаго Крыжу** было к 1 лютаму 31,230,032 руб., у лютым паступіло 2,802,659 руб., было расходу за гэты месяц 4,137,208 руб. К 1 марцу асталося 29,888,483 р.

**За дабравольны палон.** Урад пастанавіў не выдаваць «пайка» (казённай запамогі) сем'ям тых салдатоў, каторые дабравольна аддаліся у палон, або уцяклі з войска (дэзэртыры).

**Сем'і работнікоў** служачых на чыгунках і пакліканых на вайну урад прызнаў магчымым лячыць дарма на рахунак гэтых чыгунак.

**Праца для нездатных ваеваць.** Глаўнаупраўляючы земляустройствам загадаў усім установам глаўнаго упраўленьня прыймаць на службу на свабодные мейсцы толькі салдатоў-ваякоў цяперашняй вайны. Тое самае загадана у лесной, рыбнай і іншых гаспадарках залежных ад семляустройства прыймаць на службу толькі ваякоў, выбыўшых з строю але яшчэ прыдатных да працы.

**Вучыцелі на вайне.** З лічбы вучыцелёў цэркоўна-прыхадзкіх школ болей чым 4,000 душ паклікана на вайну.

**Аб „пайку“.** Казённым палатам загадано, каб не адлічывалі для сплаты доўгу або іншых вылічэк з грошы, выдаваных як запамогу сем'ям ваякоў або як пэнсіон ваякам ці іх удовам і сіротам.

**Дармовая перавозка работнікоў.** Губэрнатарам загадана выдаваць без задзержкі пасьведчэньні работнікам для дармавога праезду іх у Донецкіе капальні угля.

**Правы кабет.** Рада міністроў пастанавіла выдаваць кабетам, скончыўшым кіеўскую ці петраградзкую палітэхніку, дыплёмы з усімі належнымі правамі, як і мужчынам, скончыўшым гэтые палітэхнікі.

**Запасы збожа у Расеі.** К 1 лютаму сёлетняго году усяго збожа, якое можна было падрахаваць, было у Расеі 57,327,000 пуд., на 24,539,000 пуд. меней, чымся ў гэтым часе ў 1913 г.

**У Турмах.** К 1 лютаму сёлетняго году было ва ўсіх расейскіх турмах 171,000 людзей з лішнім. У гэтым часе у 1913 г. было іх 197,000.

**Для паліціі.** Рада міністроў асыгнавала 150,000 руб. на запамогі для паліціі, пацярпеўшай пры выпаўненьні сваіх абавязкоў, і 250,000 руб. на над'звычайные расходы на паліцію ў губэрнях Варшаўскаго генерал-губэрнатарства у звязку с цяперашнім часам.

**Расейскае золата.** «Веч. Вр.», пішэ, што з усходней Сібіры невядомые агенты скупліваюць і вывозюць за граніцу расейскае золата.

**Жыды і земля.** Сэнат раз'ясьніў, што павэдлуг 811 стацьці, жыды маючые ўласную зямлю, не маюць права прадаваць гэту зямлю асобам не жыдоўскай веры.

**Казённая таргоўля гарэлкай.** Агулам за ўвесь 1914 год прададзена ў Эўропейск. Расеі 50,544,754 вядры гарэлкі, тады калі ў 1913 гаду продадзена каля 100 мільёноў вёдзер.

**Аб казённай прадажы гарбаты.** Пад загадам таварыша міністра фінансоў адбываецца цяперака асаблівая нарада аб тым, як наладзіць у Расеі казённую манаполь гарбаты.

**Прызыў чэхоў і словакоў.** Ўсёлятні прызыў прызываюцца на военную службу прыняўшые расейскае падданство чэхі і словакі — ратнікі першаго разраду.

**З'езд славакоў.** У Маскве 9 мая маніцца адбыцца з'езд славацкіх дзеячоў з Расеі і Амэрыкі. На гэтым з'ездзі будзе апрацованы мэмор'ял (асаблівы дакумэнт) аб палажэньні славакоў і пададзены прэдстаўнікам Расеі, Франціі і Англіі.

**Новые „бумажкі“.** Міністэрство фінансоў апрацовывае праект выпуску ў сьвет рублёвых і трохрублёвых «бумажак» на 500 мільёноў руб., не падлегаючых абавязковай змены на золата.

**Кары на друкаванае слова.** За ўвесь 1914 г. сконфіскована 465 часопісёў і 230 іншых выдавецтвоў. Знiстожэна па прыгавору судоў 69 часопісёў і 89 іншых друкоў.

**Ссылка Бурцэва.** Засуджэны у ссылку В. Бурцэв надовічы высланы у Енісейскую губ.

**Стрэляніна.** Надовічы ночай ў цэнтры г. Баку узнялася стрэляніна паміж двума гарадавымі і чатырма злачынцамі. Адзін катаржнік забіты, а двух затрымалі. Абодвы гарадавые забіты.

**Паводкі.** С Кіева паведамляюць, што страшэнна разліўся Днепр і затапіў каля 200 дамоў у ніжэйшых мейсцох гораду. Жыхаром прыходзіцца перэежджаць на чоўнах. У Мітаві с прычыны разліву дзьвух рэк заліло ніжэйшые часьці гораду. Жыхары загадзя выратаваліся.

**У Фінляндзіі** ўласьці забаранілі сяліцца дачнікам у шхэрах Ботніцкай затокі. Дамаўласьнікі у выбарскай губ., аддаючые у арэнду дачы, вымагаюць ад арэндатороў падпіскі аб тым, што на першае жаданьне ўласьцяў яны у 24 гадзіны выедуць з нанятаго памяшчэньня. Апрача таго наймаючых дачы ў прыбярэжнай паласе асьцерэгаюць, што на жаданьне адміністраціі яны не павінны запаліваць агню ў памешчэньнях з вокнамі на морэ.

**У Польшчы.** У радомскай і келецкай губ., ў некаторых паветах, блізкіх ад району ваенных змаганьнёў, выселяюць рэшту жыдоўскаго населеньня Выселяюцца усе жыды без ніякай розніцы. — У аколіцы Прушкова каля Варшавы месяц ужо з лішнім гаспадарыць разбойніцкая банда. С пачатку была яна с 5 людзей, а цяперака мае ўжо 13. Зрабілі ўжо яны некалькі нападоў і ўбіўствоў, і ніякім чынам ня могуць іх злавіць. У часе нападу маюць завязаные хусткамі твары. Кажуць, што гэта маладые людзі і не зусім простаго званьня.

**У Галіччыні.** «Нов. Вр.» пішэ, што упраўленьне народных школ у Галіччыні апрацавало праект агульнаго навучаньня. Павэдлуг праекту мае быць аткрыта там 25 для хлапцоў і 25 для дзеўчат гімназій, 70 вышэйшых народных школ, 9 тысяч народных школ, 10 вучыцельскіх сэмінарый і 2 вучыцельскіе інстытуты. Да гэтаго часу аткрыта у Галіччыні 35 цэркоўна-прыхадзкіх школ.

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

**Падмайстры — сьлесары, кавалі і вучні** здольные да працы **патрэбны зараз.** Заработак ад рубля да 3-х рубл. у дзень. Праца пастаянная.
*Вільня, Сіроцкая вул., д. № 6. Ціхош.*

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.